НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

# ЗДАБЫТКІ

## ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ НА БЕЛАРУСІ

ВЫПУСК 23

Мінск 2020

УДК 002.2
ББК 78.56 + 78.36
З46

Складальнікі:
Т. А. С а п е г а, А. А. С у ш а, К. В. С у ш а

Рэдакцыйная калегія:
Р. С. М а т у л ь с к і, доктар пед. навук (гал. рэд.), Г. Я. Г а л е н ч а н к а, доктар гіст. навук, А. А. Г у ж а л о ў с к і, доктар гіст. навук, Л. Г. К і р у х і н а, Г. У. К і р э е в а, Т. В. К у з ь м і н і ч, канд. пед. навук, В. Е. Л я в о н ч ы к а ў, доктар пед. навук, У. В. М а к а р а ў, доктар філ. навук, У. Ф. М а р т ы н а ў, доктар культуралогіі, А. І. С м о л і к, доктар культуралогіі, А. А. Суша, кандыдат культуралогіі

Рэцэнзенты:
Ю. А. Л а б ы н ц а ў, доктар філ. навук,
Н. Ф. В ы с о ц к а я, доктар мастацтвазнаўства

Адказны за выпуск К. В. Суша

З46 **Здабыткі** : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнікі: Т. А. Сапега, А. А. Суша, К. В. Суша. – Мінск, 2020. – Вып. 23. – 270, [1] с.

Чарговы зборнік навуковых прац Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працягвае публікацыю матэрыялаў па праблемах дакументальных помнікаў на Беларусі, іх даследаванняў і ўводзіць у навуковы ўжытак дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кнігі і культуры Беларусі.

Зборнік уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі.

**УДК 002.2**
**ББК 78.56 + 78.36**

**ISSN 1726–5800**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2020

*З М Е С Т*

Ад складальнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**Друкаваная спадчына**

*Суша А.А.* Віленскія Буквары 1618–1621 гг. і фарміраванне традыцыі падручнікаў для пачатковага навучання грамаце . . . 7

*Цітавец А.І.* Спадчына Спірыдона Собаля (з фонду Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) . . . . . . . . . . . . . . . . 27

*Данилов А.В., Нелидкин В.В.* Розенкрейцерские переводы конца XVIII – начала XIX в. в фондах Национальной библиотеки Беларуси . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

*Góra B.* «Notatka o Nieświeżu» Ludwika Kondratowicza (Władysława Syrokomli) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63

**Рукапісная спадчына**

*Лысенко Е.С.* Манускрипт «Сад достойнейших, выбранный из “Весны благочестивых”» из коллекции восточных рукописей Национальной библиотеки Беларуси . . . . . . . . . . 75

**Гістарычныя кнігазборы**

*Булаты П.Ю.* Бібліятэка каталіцкай парафіі Святога Крыжа ў Ляхавічах у XVIII ст.: даследаванне кніжнага фонду . . . . 84

*Сільнова Л.Д.* Кнігі з пячаткамі Інстытута беларускай культуры ў калекцыі «Бібліятэка К. Грота ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93

*Шопіна М.М.* Кнігі са збору «караля вузкакалейнай чыгункі» ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі . . . . . . . . . . . 104

**Гісторыя кнігі**

*Кузьмініч Т.В.* Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: шляхі развіцця ў міжваенны час (1921–1939) . . . . . . . . . . . . . . . . . 116

*Палунчанка В.М.* Кніга як феномен культурнай прасторы Нясвіжа ў кантэксце асветніцка-выхаваўчых працэсаў XVIII ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145

*Романенкова Г.Н.* К вопросу истории создания полоцкой городской газеты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155

## Правененцыі

*Лісейчыкаў Д.В.* «Хто чытае, той спявае, хто піша, той уздыхае»: выкарыстанне кніг «Собраніє припадковъ…» у якасці нататнікаў парафіяльным уніяцкім духавенствам беларуска-літоўскіх зямель XVIII – пачатку XIX ст. . . . . . 163

*Лаўрык Ю.М.* Па слядах аднаго міфа: да пытання пра выкарыстанне знака «IHS» у аздабленні айчынных кніжных апраў XVI–XVIII стст. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177

## Кнігі і аўтографы

*Пахоменкова С.Г.* «Ея Императорскому Величеству Государыне Императрице Марии Федоровне…» (две книги с дарственными надписями вдовствующей российской императрице в фонде научно-исследовательского отдела книговедения Национальной библиотеки Беларуси) . . . . . 192

*Усова Н.М.* Неизвестный автограф Корнея Чуковского в архиве семьи Михальчук (Минск) и первые послевоенные издания сказок Чуковского в БССР . . . . . . . 204

## Мастацтва кнігі

*Курганова Е.Ю.* Типологические аналоги художественных инноваций Франциска Скорины в украинской старопечатной книге . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 214

*Зварыка І.М.* Партрэт Францыска Скарыны. Раман з люстэркам . 225

*Зеленский Т.В.* Спорные вопросы атрибуции и датировки предметов графики, созданных в честь Николая Христофора Радзивилла Сиротки в начале XVII в. . . . . . . 236

## Архіўныя дакументы

*Chomik P.* Źródła do dziejów Kościoła prawosławnego w archiwach miasta Białegostoku . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247

## Персаналіі

*Денисенко Е.П.* Рукописное и книжное наследие Антона Гриневича в фондах Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 257

Звесткі аб аўтарах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269

## *АД СКЛАДАЛЬНІКАЎ*

Нацыянальная бібліятэка Беларусі праводзіць шматпланавую дзейнасць па вывучэнні і папулярызацыі нацыянальнай кніжнай спадчыны. Важным напрамкам гэтай дзейнасці з’яўляецца публікацыя даследаванняў па гісторыі кніжнай культуры Беларусі. Гэтай мэце ўжо 25 гадоў служыць зборнік «Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі», які быў заснаваны ў 1995 г. і на сёння з’яўляецца вядучым навуковым выданнем Рэспублікі Беларусь у галіне кнігазнаўства. Матэрыялы зборніка адлюстроўваюць дасягненні беларускай кнігазнаўчай навукі ў кантэксце сусветных тэндэнцый развіцця бібліялогіі і накіраваны на асэнсаванне здабыткаў шматвяковай гісторыі беларускай кніжнай культуры.

За час свайго плённага існавання выданне стала грунтоўнай платформай для даследчыкаў кніжнай культуры. На яго старонках публікуюцца матэрыялы кнігазнаўчага, бібліятэказнаўчага, мастацтвазнаўчага, гістарычнага, культуралагічнага характару. У артыкулах зборніка прадстаўлены вынікі даследавання рукапіснай і друкаванай спадчыны, адкрываюцца новыя старонкі гісторыі кніжнай і бібліятэчнай справы ў Беларусі, уводзяцца ў навуковы ўжытак унікальныя кніжныя помнікі, раскрываюцца калекцыі рукапісных, старадрукаваных і рэдкіх кніг, што захоўваюцца ў фондах бібліятэк, музеяў, архіваў Беларусі і замежных краін. У фокусе ўвагі аўтараў таксама пытанні мастацтва кнігі, бібліяфільства, гістарычных кнігазбораў і правененцый.

Дваццаць трэці выпуск зборніка змяшчае публікацыі, якія ўводзяць у навуковы ўжытак новыя матэрыялы, звязаныя з гісторыя кніжнай культуры Беларусі. Пад увагай даследчыкаў мастацкія асаблівасці выданняў Францыска Скарыны: публікуецца аналіз яго партрэтнай гравюры, а таксама робіцца асэнсаванне мастацкіх інавацый у кнігах Ф. Скарыны і іх уплыву на ўсходнеславянскае кнігадрукаванне. Працягваецца даследаванне беларускіх букварoў: у зборніку змешчана навуковае апісанне віленскіх падручнікаў 1618–1621 гг. Сярод матэрыялаў выпуску – вывучэнне спад-

чыны беларускага кнігадрукара Спірыдона Собаля; аналіз твораў кніжнай графікі, створаных у пачатку XVII ст. у гонар віленскага ваяводы Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі; даследаванне кніжнай прасторы Нясвіжа ў XVIII ст.; вывучэнне масонскага кнігавыдання на тэрыторыі Расійскай імперыі ў XVIII–XIX стст. Публікуюцца матэрыялы, прысвечаныя рукапіснай і друкаванай спадчыне выдатных дзеячаў беларускай культуры – Уладзіслава Сыракомлі, Баляслава Ялавецкага, Антона Грыневіча. У шэрагу артыкулаў асвятляецца лёс беларускіх гістарычных кнігазбораў (каталіцкай парафіяльнай бібліятэкі XVIII ст. у Ляхавічах, бібліятэкі Інстытута беларускай культуры 1920-х гг. і інш.), разглядаюцца правененцыі і аўтографы як каштоўныя складнікі гісторыі бытавання кнігі, даследуюцца рукапісная і архіўная спадчына, перыядычны друк і іншыя пытанні. Таксама надрукаваны артыкул, прысвечаны аналізу развіцця беларускай нацыянальнай бібліяграфіі ў 1921–1939 гг. як важнага фактару захавання гістарычнай памяці грамадства. Раскрываюцца кніжныя калекцыі найбуйнейшых беларускіх навуковых бібліятэк – Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Артыкулы размешчаны па тэматычных раздзелах: «Друкаваная спадчына», «Рукапісная спадчына», «Гістарычныя кнігазборы», «Гісторыя кнігі», «Правененцыі», «Кнігі і аўтографы», «Мастацтва кнігі», «Архіўныя дакументы», «Персаналіі». Сярод аўтараў зборніка – навукоўцы, спецыялісты бібліятэк і музеяў, выкладчыкі ВНУ з Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы.

Зборнік адрасаваны кнігазнаўцам, гісторыкам, філолагам, культуролагам, спецыялістам бібліятэк, музеяў і архіваў, а таксама бібліяфілам і ўсім, хто цікавіцца беларускай і сусветнай кніжнай спадчынай.